ISSN 0321-1649 (print)

## *РЭЦЭНЗІІ*
### *REVIEWS*

Поступила в редакцию 31.05.2016
Received 31.05.2016

**М. П. Касцюк**

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# УВАГА ДА САМЫХ СТАРАЖЫТНЫХ ЭПОХ

Манаграфічная праца[1] доктара гістарычных навук, дацэнта В.А. Пілецкага ўяўляе сабою арыгінальнае даследаванне па многіх аспектах. Гэта і надзвычай старажытны перыяд, і аб’ект даследавання, і яго прадмет, і тыя падыходы, што выкарыстоўвае аўтар, і характарыстыкі, якія ў ім маюцца, і назіранні па многіх сюжэтах тэмы і інш. Для вырашэння заяўленых задач аўтар, у прыватнасці, паставіў перад сабою мэту даць характарыстыку зараджэння і станаўлення працэсу перадачы грамадскага досведу новым пакаленням у тыя далёкія часы.

Звяртае на сябе ўвагу храналагічны падыход аўтара да гістарычнага працэсу. Гэта нават не перыяд, як ён называе, а цэлы шэраг эпох з працэсу станаўлення найстаражытнейшага чалавека на тэрыторыі Беларусі. У кнізе гэта вымяраецца адлегласцю ад таго часу, калі тут з’явілася першая чалавекападобная істота, а гэта 100–40 тысячагоддзяў да нашай эры і да распаўсюджання хрысціянства.

Аўтара цікавіць працэс выхавання і адукацыі падрастаючых пакаленняў на ўсіх тых этапах, якія папярэднічалі з’яўленню школы як новай, раней невядомай гістарычнай структуры ў выхаванні і адукацыі дзяцей. Нельга не звярнуць увагу, што ў рэцэнзуемай кнізе пададзена спецыфіка форм, метадаў, зместу выхаваўча-адукацыйнага працэсу, прасочваецца імкненне сфармуляваць асноўныя рысы пэўных стадый гістарычнай эвалюцыі ў выхаваўча-адукацыйным працэсе.

Цікава, што манаграфічнае даследаванне змяшчае грунтоўны гістарыяграфічны аналіз па выбранай для вывучэння тэме. У прыведзенай бібліяграфіі пададзены каля 1000 найменняў айчыннай і замежнай літаратуры і крыніц як непасрэдна па прадмеце даследавання, так і тых выданняў, што ў той ці іншай ступені характарызуюць яго з розных пунктаў гледжання.

Акрамя гістарыяграфіі, у працы прысутнічае і аналіз крыніцазнаўчай базы па самых розных напрамках гуманітарных ведаў, але якія скіраваны на прадмет даследавання. Іх спецыфіка таксама вызначаецца тымі амаль дагістарычнымі эпохамі, якія падае аўтар у сваім выданні. Характэрна, што гэтыя крыніцы нават не толькі археалагічныя, а ў значнай ступені ўскосныя, але яны дапамагаюць адцяніць тыя ці іншыя рысы прадмета даследавання. Да таго ж патрэбна мець на ўвазе, што розны і ўнікальны дакументальны матэрыял на тэрыторыі Беларусі, як і ў іншых рэгіёнах, перыядычна знішчаўся ў выніку такой аб’ектыўнай з’явы, як абледзяненні, што прыводзілі да змывання тагачасных культурных пластоў. Гістарыяграфіі і аналізу крыніц у кнізе адведзена 1-ая глава.

У 2-й главе «Выхаваўча-адукацыйны працэс як кірунак дзейнасці чалавецтва» аўтар прааналізаваў спецыфіку выхаваўча-адукацыйнага працэсу як адной са сфер жыццядзейнасці чалавецтва ў далёкім мінулым. Тут пададзена перыядызацыя эвалюцыі выхаваўча-адукацыйнага працэсу падчас старажытнасці і сярэднявякоўя, а таксама паказаны ўмовы, у якіх адбылося ўзнікненне найстаражытнейшых яго форм. Раскрыта значэнне тэрміна «выхаваўча-адукацыйны працэс» і падкрэслена, што ён мае ўніверсальны характар і з’яўляецца найбольш прымальным для характарыстыкі такой гістарычнай з’явы, як перадача вопыту. Адзначана, што працэс падрыхтоўкі дзяцей да дарослага жыцця, па сутнасці, адзіны ва ўсёй гісторыі чалавецтва, нягледзячы на розныя яе эпохі і стадыі эвалюцыі выхавання. Паказана, што найстаражытнейшы жыхар тэрыторыі Беларусі – неандэрталец, які знаходзіўся на апошняй ступені пераходу ад жывёлы да чалавека, ужо валодаў якасцямі, якія дазвалялі перадаваць накоплены вопыт сваім нашчадкам.

[1] Пілецкі, В. А. Выхаваўча-адукацыйны працэс у гісторыі Беларусі дахрысціянскага перыяду: манаграфія / В. А. Пілецкі. – Мінск: Ковчег, 2013. – 372 с.

© Касцюк М. П., 2016

У 3-й главе «Зараджэнне выхаваўча-адукацыйнай практыкі на беларускіх землях» на матэрыялах даследаванняў вучоных-прыматолагаў выяўлена, што яшчэ задоўга да першагістарычнага з'яўлення людзей (г. зн. на стадыі вышэйшых прыматаў) рацыянальна-вопытныя веды адукацыйнага кшталту значна ўплывалі на выжывальнасць супольнасцей тых далёкіх продкаў чалавека. Гэта падштурхнула аўтара да думкі аб тым, што набыццё выхаваўча-адукацыйнага вопыту на ўзроўні першага прадстаўніка чалавека на тэрыторыі Беларусі (неандэртальца) таксама ўключала ў сябе як выхаваўчыя набыткі, так і рацыянальныя веды адукацыйнага, у сучасным разуменні, характару. Адзначана таксама, што найстаражытнейшымі паказчыкамі наяўнасці генезісу выхаваўча-адукацыйнага працэсу, зараджэння і станаўлення яго ў якасці асобнай грамадскай з'явы было ўсведамленне насельніцтвам Беларусі падзелу людзей на ўзроставыя катэгорыі.

У наступнай, 4-й главе «Падрыхтоўка дзяцей у эпоху родавага ладу на тэрыторыі Беларусі» падкрэслена, што эпоха раннеродавага ладу, нягледзячы на адносна прымітыўныя формы жыццядзейнасці грамадства, была крокам наперад у ажыццяўленні грамадскага выхаваўча-адукацыйнага працэсу. Ішло накапленне ведаў пра навакольнае асяроддзе, навыкаў выканання розных бытавых спраў, сацыяльных узаемаадносін, стваральна-накапляльнай, здабытковай дзейнасці, элементарных абрадавых дзеянняў і іншых форм грамадскага існавання. Працэс перадачы вопыту дзецям галоўным чынам адбываўся ў працэсе абраднасці: паляўніча-рыбалоўнай, вытворчай, бытавой, рэлігійна-ідэалагічнай і іншай. Выключна важную ролю ў падрыхтоўцы дзяцей да жыццёвай практыкі адыгрывалі мужчынскія тайныя саюзы і мужчынскія дамы. На пэўным этапе мужчынскія саюзы набылі функцыі арганізатараў барацьбы за звяржэнне матрыярхальных устояў грамадства, аб чым сведчаць шматлікія гістарычныя крыніцы.

Глава 5-я «Выхаваўча-адукацыйны працэс раннесярэдневяковага грамадства (VI – канец X ст.)» змяшчае матэрыялы аб выхаваўча-адукацыйным працэсе параўнальна высокай ступені развіцця. Аснову яго зместу складалі эканамічныя веды, неабходныя для выжывання грамадства, сацыяльна-абрадавыя, ідэалагічна-рэлігійныя і іншыя – усе тыя, якія былі патрэбны падрастаючаму чалавеку для авалодання навыкамі выжывання, вопытам, назапашаным да часу яго прыходу ў жыццё.

Са з'яўленнем маёмаснай няроўнасці паступова афармляліся прынцыповыя адрозненні ў змесце навучання і выхавання дзяцей асноўных сацыяльных груп тагачаснага грамадства: сялян-абшчыннікаў, рамеснікаў, племянной знаці, што паступова феадалізавалася, і язычніцкіх жрацоў. На тэрыторыі беларуска-расійска-ўкраінскага рэгіёна, па сведчаннях даследчыкаў (С. Я. Лур'е і У. Я. Пропа), выведзеных з этнаграфічных, археалагічных і іншых гістарычных крыніц, такой формай перадачы вопыту былі так званыя «лясныя дамы».

Далейшае станаўленне структуры грамадства прывяло да ўзнікнення новых форм навучальна-выхаваўчай справы, такіх як рамеснае і жрэцкае вучнёўства, дамы-грыдніцы, для падрыхтоўкі падлеткаў з ваенна-феадалізаванага саслоўя, выхавальніцтва, якое, па сведчанні гістарычных крыніц, трывала дзейнічала ў княжацкім асяроддзі, вандроўныя настаўнічаючыя асобы, якія ўспамінаюцца ў старажытных дакументах беларуска-расійска-ўкраінскага рэгіёна.

У 6-й главе «Пераход да хрысціянскага выхаваўча-адукацыйнага працэсу» заяўлена, што, грунтуючыся на пісьмовых крыніцах раннедзяржаўнага перыяду гісторыі Беларусі, можна адзначыць у якасці праобраза новай формы выхаваўча-адукацыйнага працэсу візантыйскі тып узаемаадносін: школа–царква–дзяржава. Асаблівасцю візантыйскай мадэлі з'яўлялася поўнае падпарадкаванне школы царкве, якая ў сваю чаргу выконвала ролю ідэалагічнай структуры феадальнага грамадства пры верхавенстве свецкай улады над царкоўнай. Летапісныя «школы вучэння кніжнага» мелі царкоўна-катэхізісную накіраванасць і прызначаліся для распаўсюджвання царкоўна-хрысціянскай дактрыны. Жыццёва-рацыянальны вопыт яшчэ ў той час трансліраваўся праз традыцыйныя формы, вядомыя з першабытнасці, але гістарычная перспектыва ўжо была на баку хрысціянскага выхаваўчага працэсу. Падкрэслена таксама (хоць, на наш погляд, даволі каротка і павярхоўна) роля жрэцтва ў выхаваўча-адукацыйнай справе насельніцтва Беларусі эпохі існавання летапісных княжанняў-княстваў. Жрацы, па меркаванні аўтара, былі галоўнымі арганізатарамі, ідэолагамі і выканальнікамі тагачаснага педагагічнага працэсу, а таксама адзінымі ў грамадстве выхавальнікамі моладзі, вызваленымі ад эканамічна-здабытковай дзейнасці.

Нельга не звярнуць увагу на такі прыём аўтара, як канцэнтрацыя асноўных высноў па тых ці іншых напрамках тэмы ў «Вывадах да глаў». Уяўляецца, што гэта апраўдана і з боку формы падачы матэрыялу, і яго зместу. Сярод іншага ў такіх заключэннях да глаў прыведзена аўтарскае азначэнне выхаваўча-адукацыйнага працэсу. Ён «уяўляе сабою навуковую катэгорыю, якая мае ўніверсальны характар і з'яўляецца найбольш прымальнай для аналізу сферы перадачы вопыту ў гісторыі грамадства» (с. 103).

Зыходзячы з такой пасылкі, аўтар падчас даследавання прыходзіць да вываду, што працэс перадачы вопыту новым пакаленням пачаўся яшчэ задоўга да таго, як на тэрыторыі Беларусі з'явіўся першы чалавекападобны жыхар – неандэрталец. Ужо тады гэта мела не толькі выхаваўчы, але і адукацыйны характар.

Цікавай з'яўляецца таксама выснова аўтара аб тым, што храналагічныя межы генезісу выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў гісторыі Беларусі пачынаюцца з часоў "сацыялізацыі" выхавання, якую прынята лічыць

завершанай ужо на стадыі існавання палеаантрапа. Пры гэтым заўважана, што краманьёнец (неаантрап), які з'явіўся на нашай тэрыторыі каля 40–35 тысячагоддзяў таму, быў ужо чалавекам сучаснага антрапалагічнага тыпу.

Звяртае на сябе ўвагу тая акалічнасць, што аўтар імкнецца да пэўных навуковых абагульненняў, хаця прымяняльна да тых далёкіх эпох зрабіць гэта зусім не проста. Тым не менш, маючы на ўвазе асноўны прадмет свайго навуковага даследавання – выхаваўча-адукацыйны працэс, у кнізе пададзена нямала і іншых цікавых назіранняў. У прыватнасці, да гэтага адносіцца сцвярджэнне аб тым, што на пэўным этапе эвалюцыі мужчынскія саюзы набылі функцыі арганізатараў барацьбы за звяржэнне матрыярхальных устояў грамадства (с. 187).

У імкненні як мага глыбей пранікнуць у сутнасць даследуемага прадмета аўтар нярэдка прыводзіць цікавыя назіранні і факты, грунтуючыся на этнаграфічных, археалагічных і іншых крыніцах. Так, адной з форм перадачы жыццёвага вопыту падлеткам былі адзначаныя намі вышэй так званыя лясныя дамы. У іх на даволі працяглы тэрмін ізаляваліся дзеці, выхадцы з агульнаабшчыннага асяроддзя. Пры гэтым жорстка забараняліся іх кантакты з суродзічамі. У такіх абставінах спецыяльна прызначаныя людзі перадавалі ім назапашаны грамадскі вопыт па розных напрамках жыццёвай практыкі. Аўтар звяртае ўвагу і на вандроўных настаўнічаючых асоб, і на іншыя формы перадачы сацыяльна значных ведаў.

Асаблівасцю падачы матэрыялу па выбранай тэме з'яўляецца выкарыстанне таго вопыту, які меўся ў першую чаргу ў Візантыйскай імперыі, а таксама на іншых тэрыторыях і ў іншыя часы. Гэта тым больш цікава, што імператарскае візантыйскае праўленне за тысячагадовую гісторыю свайго існавання назапасіла вялікі досвед у справе выхавання і адукацыі падрастаючага пакалення. Візантыйскі вопыт нам асабліва цікавы і тым, што менавіта ён нават у дахрысціянскія часы распаўсюджваўся на поўнач, дасягаючы тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Акцэнтуючы асноўную ўвагу на дахрысціянскім перыядзе ў разглядзе свайго прадмета даследавання, аўтар тым не менш выходзіць у агульных рысах і на канец I тысячагоддзя нашай эры, закранаючы ў некаторых аспектах час распаўсюджання хрысціянскай веры. У сувязі з гэтым у кнізе правамерна сцвярджаецца, што ў выніку магутнага ўплыву царквы на выхаванне і адукацыю падлеткаў змяніліся не толькі асноўныя формы і змест арганізацыі гэтага працэсу, але нават «сутнаснае напаўненне». Выхаваўча-адукацыйны працэсператварыўся з адукацыйна-выхаваўчага ў выхаваўча-адукацыйны (с. 292).

Закранаючы ў некаторай ступені ролю жрэцтва ў выхаваўча-адукацыйнай справе на тых этапах развіцця чалавечага грамадства, аўтар пэўным чынам падае і значэнне язычніцтва ў дадзеным напрамку, аднак з нашага пункта гледжання яго значэнне магло б быць раскрыта шырэй і глыбей, асабліва калі зыходзіць з паўсюднага панавання такіх вераванняў на землях Беларусі ў тыя даўнія часы.

Акрамя гэтага, наўрад ці можна лічыць доказаным з-за абмежаванасці крыніц пытанне наяўнасці мужчынскіх тайных саюзаў у жыцці дахрысціянскага насельніцтва Беларусі. Да таго ж, ці можна пагадзіцца, што легенды пра ваўкалакаў (пярэваратняў) пацвярджаюць наяўнасць ініцыяцый і з'яўляюцца доказам існавання выхаваўча-адукацыйнага працэсу?

Можна задацца і некаторымі іншымі пытаннямі. Але не выклікае сумненняў тое, што аўтар выканаў вельмі складаную працу. Ён змог сфармуляваць якасна новую навукова-гістарычную праблему. Сабраў велізарную колькасць рознабаковых крыніц і літаратуры, прааналізаваў зараджэнне практыкі перадачы вопыту ў межах Беларусі і паказаў пачатковы этап станаўлення выхаваўча-адукацыйнага працэсу, а таксама яго пераход да сярэдневяковага хрысціянскага навучання ў грамадстве, што пражывала на старажытных землях нашай краіны.

Акрамя навуковага значэння кніга, несумненна, мае і выхаваўчае. Яна можа і павінна быць выкарыстана ў школах, каледжах, вышэйшых навучальных установах не толькі з мэтаю паглыблення ў веданні адукацыйнага працэсу, але і выхаваўчага.

## Информация об авторе

*Костюк Михаил Павлович* – академик, д-р ист. наук, проф., гл. науч. сотрудник. ГНУ «Институт истории НАН Беларуси» (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: m.kasciuk@gmail.com.

## Information about the author

*Kostsyuk Mikhail Pavlovich* – Academician, D. Sc. (Hist.), Professor, Chief researcher. Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus (Akademicheskaya Str., 1, 220072, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: m.kasciuk@gmail.com.

## Для цитирования

Касцюк, М. П. Увага да самых старажытных эпох / М. П. Касцюк // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2016. – № 4. – С. 119–121.

## For citation

Kastsyk, M. P. Attention to the most ancient ears. Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus, humanitarian series, 2016, no.4, pp. 119-121.